ГРОДЗЕНСКАЯ ВОБЛАСЦЬ (/BE/GEO/19) 970

Рэдактара Ірыну Новік судзілі паўторна. Вынік — 725 рублёў штрафу

04.08.2021 Крыніца: Hrodna.life (https://hrodna.life/2021/08/03/iryna-novik-shtraf/?utm_source=telegram&utm_medium=smm) Сюжэт: Барацьба з экстрэмізмам (/be/content/baracba-z-ekstremizmam)

У судзе Ленінскага раёна 29 ліпеня паўторна разгледзелі справу ў дачыненні да Ірыны Новік, рэдактаркі спецпраектаў Hrodna.life. Яе прызналі вінаватай у распаўсюдзе экстрэмісцкіх матэрыялаў. Першы раз справу журналісткі разглядалі 3 чэрвеня. Рашэнне таго паседжання было адменена абласным судом пасля скаргі журналісткі на парушэнне права на абарону.



Ірына Новік

На паўторным разглядзе суддя Руслан Гурын вынес такі самы штраф, як раней прызначала суддзя Алена Пятрова — 25 базавых велічыняў (725 рублёў).

Новы працэс па гэтай справе прайшоў у адсутнасці журналісткі. Па стане здароўя Ірына Новік пакінула краіну, каб прайсці курс лячэння за мяжой. Яе просьбу адкласці разгляд справы да вяртання ў Беларусь суддзя Руслан Гурын адхіліў.

Журналістку асудзілі паводле артыкула 19.11 КаАП («Распаўсюд інфармацыйнай прадукцыі, якая змяшчае заклікі да экстрэмісцкай дзейнасці або якая прапагандуе такую дзейнасць»). За тое самае

парушэнне пакаралі (https://hrodna.life/2021/06/18/hrodna-life-sud2/) і рэдакцыю сайта — 18 чэрвеня суддзя Ганна Ляусік вынесла максімальны штраф у 500 базавых велічыняў (14 500 рублёў).

За што судзілі Ірыну Новік

Распаўсюдам экстрэмісцкіх матэрыялаў суд палічыў памылкова размешчанае на сайце **Hrodna.life** фота с лагатыпам Telegram-канала, прызнанага ў Беларусі экстрэмісцкім. Памылку заўважылі праз некалькі гадзін і выдалілі фота. За гэты час здымак з «экстрэмісцкім» лагатыпам паспеў заўважыць намеснік начальніка аддзелу аховы правапарадку і прафілактыкі Андрэй Пігульскі. Ён праходзіў сведкам па справе.

Першы суд над Ірынай Новік адбыўся (https://ru.hrodna.life/2021/06/03/novik/) 3 чэрвеня. Да суда яна знаходзілася ў ізалятары часовага ўтрымання на Кірава, 1. Суд прайшоў у актавай залі Ленінскага РАУС. Пра час пасяджэння папярэдняй інфармацыі не было. Адвакату таксама пра гэта не паведамілі, хаця яна накіравала ў суд хадайніцтва аб удзеле ў працэсе.

Журналістка напісала скаргу ў абласны суд. Там справу разглядаў суддзя Віктар Сянько. «Пастанову суддзі нельга прызнаць законнай, яна падлягае адмене, а справа — накіраванню на новы разгляд», — пастанавіў (https://hrodna.life/2021/07/21/peresmotr-jekstremizm/) ён 20 ліпеня.

Прысуд ад 29 ліпеня Ірына Новік таксама мае намер абскарджваць. На яе думку, суддзя прызначыў строгае спагнанне, не прыняўшы пад увагу стан здароўя і час, праведзены ў ІЧУ да разгляду справы.

Пераслед Hrodna.life

Першы суд за распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў адбыўся (https://ru.hrodna.life/2021/03/19/hrodna-life-sud-2/) 19 сакавіка. Тады суд Ленінскага раёна прысудзіў рэдактару **Hrodna.life** Аляксею Шоту штраф у 400 базавых велічынь (11 600 рублёў) — як прадстаўніку арганізацыі - і 25 базавых велічынь (725 рублёў) — як фізічнай асобе. Гродзенскі абласны суд 26 красавіка пакінуў у сіле (https://ru.hrodna.life/2021/04/26/straf-hrodna-life-oblsud/) рашэнне раённага. Выплаціць штраф у 11 600 рублёў у растэрміноўку на шэсць месяцаў рэдакцыі не дазволілі (https://ru.hrodna.life/2021/05/07/rassrochka-shtraf/).

18 чэрвеня **Hrodna.life** прысудзілі (https://ru.hrodna.life/2021/06/18/hrodna-life-sud2/) другі штраф. Цяпер ён максімальна магчымы — 14 500 рублёў. У рэдакцыі ёсць яшчэ некалькі тыдняў, каб выплаціць яго. Таксама 20 чэрвеня рэдактар атрымаў папярэджанне (https://hrodna.life/2021/07/20/preduprezhdenie-gl/) ад пракурора Гродна Уладзіміра Клішына.

2 жніўня рэдакцыя атрымала ліст аб прымусовай ліквідацыі (https://hrodna.life/2021/08/02/likvidacyja-hrodna-life/) юрасобы ТАА «Гродна Лайф Медыя», якой належыць сайт **Hrodna.life**. Пазоў у эканамічны суд «у мэтах абароны дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў» скіравала Гродзенская пракуратура. Пракурор Уладзімір Клішын сцвярджае, што «Гродна Лайф Медыа» праводзіць дзейнасць, забароненую законам. Папярэдняе пасяджэнне суда прызначана на 11 жніўня.

Самыя важныя навіны і матэрыялы ў нашым Тэлеграм-канале — падпісвайцеся! (https://t.me/bajby)

Найбольш чытанае

Коллеги в тюрьмах. Напишите им письмо поддержки АКТУАЛЬНЫЕ АДРЕСА (/be/content/kollegi-v-tyurmah-napishite-im-pismo-podderzhki-aktualnye-adresa)

Ідзе прыём матэрыялаў на конкурс «Вольнае слова» (да 1 траўня) (/be/content/idze-pryyom-materyyalau-na-konkurs-volnae-slova-da-1-traunya)

У Варшаве пачаліся здымкі поўнаметражнай карціны «8 гадоў 3 месяцы». Яна натхнёная гісторыяй кахання Кацярыны Андрэевай і Ігара Ільяша (/be/content/u-varshave-pachalisya-zdymki-pounametrazhnay-karciny-8-gadou-3-mesyacy-yana-nathnyonaya)

Прафесійны фактчэк-марафон «Давярай, але правярай!» (рэгістрацыя да 18 красавіка) (/be/content/prafesiyny-faktchek-marafon-davyaray-ale-pravyaray-registracyya-da-18-krasavika)

Сюжэты (/stories)

COVID-19 (/be/content/covid-19)

23.5 КаАП (/be/content/235-kaap)

Рэгуляванне Байнэту (/be/content/regulyavanne-baynetu-0)

Аўтарскія калонкі (/blogs)

Анна Ефременко: белорусского языка в моей жизни за пределами стерильных рамок уроков не было вовсе (/be/content/anna-efremenko-belorusskogo-

Распаўсюд СМІ (/be/content/raspausyud-smi)

yazyka-v-moey-zhizni-za-predelami-sterilnyh-ramok-urokov-ne-bylo)

Спецпраекты (/analytics/27)



(/be/analytics/zhurnalist-i-galouny-redaktar-yak-parazumecca-seryya-no1)

Журналіст і галоўны рэдактар: як паразумецца? (Серыя №1) (/be/analytics/zhurnalist-i-galouny-redaktar-yak-parazumecca-seryya-no1)

Важнае



(/be/analytics/shto-matyvue-udzelnichac-u-bazhnym-zhycci-infagrafika)

Што матывуе ўдзельнічаць у “БАЖным” жыцці? (Інфаграфіка) (/be/analytics/shto-matyvue-udzelnichac-u-bazhnym-zhycci-infagrafika)



(/be/content/freedom-house-belarus-u-dzyasyatcy-naygorshyh-krain-pa-svabodze-slova)

Freedom House: Беларусь – у дзясятцы найгоршых краін па свабодзе слова (/be/content/freedom-house-belarus-u-dzyasyatcy-naygorshyh-krain-pa-svabodze-slova)



(/be/analytics/zakratavany-yubiley-pra-gonar-byc-syabram-i-kalegam-andreya-alyaksandrava)

Закратаваны юбілей. Пра гонар быць сябрам і калегам Андрэя Аляксандрава (/be/analytics/zakratavany-yubiley-pra-gonar-byc-syabram-i-kalegam-andreya-alyaksandrava)

*Беларуская асацыяцыя журналістаў

Copyright © 2008-2023 Беларуская асацыяцыя журналістаў

e-mail: press@baj.by (mailto:press@baj.by)
Рэдакцыйная палітыка сайта (/be/editorial_policy)